# ДАДАТАК

## РЭЗАЛЮЦЫЯ

XXV Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі
«Гарэцкія чытанні» (Мінск, 22 чэрвеня 2017 года)
і Круглага стала, прысвечанага пытанням музеефікацыі
літаратурных мясцін (Магілёў, 23 чэрвеня 2017 года)

Удзельнікі круглага стала віталі рашэнне ўладаў Мсціслаўскага раёна аб захаванні Літаратурнага музея імя Максіма Гарэцкага ў в. Малая Багацькаўка, беручы пад увагу значнасць асобаў Максіма і Гаўрылы Гарэцкіх, якія там нарадзіліся, і ў сувязі з гэтым важнасць захавання дадзенага гістарычнага асяроддзя.

У выніку канферэнцыі і круглага стала былі вынесены наступныя прапановы:

Прапанова I.

1. Выдаць зборнік матэрыялаў канферэнцыі «XXV Гарэцкія чытанні» (матэрыялы здаць да 17.07.2017).

2. Стварыць аргкамітэт па святкаванні 125-гадовага юбілею класіка беларускай літаратуры, навукоўца, педагога і асветніка Максіма Гарэцкага (1893–1938).

3. Прыцягнуць увагу грамадскасці да 125-гадовага юбілею класіка беларускай літаратуры, навукоўца, педагога і асветніка Максіма Гарэцкага (1893 – 1938) і абвясціць 2018 год Годам Максіма Гарэцкага. Распрацаваць план мерапрыемстваў, прысвечаных 125-годдзю з дня нараджэння Максіма Гарэцкага, у тым ліку ў краінах, дзе пражываў М.Гарэцкі (Літва, Латвія, Расія і інш.), з удзелам дыпламатычных прадстаўніцтваў РБ і беларускіх суполак.

4. Арганізаваць шэраг мерапрыемстваў, прысвечаных 125-годдзю з дня нараджэння пісьменніка, ва ўстановах культуры і адукацыі; адкрыць часовыя экспазіцыі выданняў твораў М.Гарэцкага, кніг і публікацый, прысвечаных яго жыццю і творчасці.

5. Арганізаваць шэраг літатаратурных вандровак па мясцінах, звязаных з жыццём і творчасцю Максіма Гарэцкага з абавязковым наведваннем Літаратурнага музея імя Максіма Гарэцкага ў в. Малая Багацькаўка Мсціслаўскага раёна для вучняў сярэдніх школ Магілёўскай вобласці, студэнтаў філалагічных спецыяльнасцяў ВНУ рэспублікі.

6. Распачаць у найбліжэйшы час падрыхтоўку і здзяйсненне фундаментальнага выдання творчай спадчыны Максіма Гарэцкага ў выглядзе



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

Збору твораў, а таксама адпаведнае выданне аднатомнага энцыклапедычнага даведніка «Максім Гарэцкі».

7. Мясцовым уладам арганізаваць семінар пад эгідай Нацыянальнага агенцтва па турызме з удзелам мясцовых турыстычных кампаній з мэтай пракладання турыстычнага маршруту праз в. Расна, г. Горкі, г. Мсціслаў, в. Малая Багацькаўка і інш. і актыўнай яго рэкламы.

8. Выдаць да юбілейнай даты паштовую марку і канверт.

Прапанова ІІ.

Падтрымаць на ўсіх узроўнях ініцыятыву стварэння музея А. Адамовіча ў в. Глуша Бабруйскага раёна Магілёўскай вобласці.

1. Стварыць апякунскі савет з прадстаўнікоў мясцовых уладаў, грамадскасці, музейнай супольнасці для кантролю за расходваннем сродкаў на стварэнне музея А. Адамовіча ў в. Глуша Бабруйскага раёна Магілёўскай вобласці.

2. Мясцовым уладам арганізаваць святкаванне 90-годдзя з дня нараджэння Алеся Адамовіча ў верасні 2017 года. Установе «Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры» ў межах святкавання арганізаваць часовую экспазіцыю.



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.

To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm